**Альхімёнак, М.** Плячо ў плячо з мужчынамі / М. Альхімёнак // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1964. – 4 ліп. – С. 3.

# ПЛЯЧО Ў ПЛЯЧО З МУЖЧЫНАМІ

Сёння працоўныя нашай рэспублікі адзначаюць 20-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Разам з усімі ганарацца вялікім подзвігам народа і нашы жанчыны. Яны ўнеслі ў перамогу над ворагам вялікі ўклад.

У гады вайны жанчыны замянялі сабой пайшоўшых на фронт мужчын. Гераічнай працай яны забяспечвалі Савецкую Армію прадуктамі харчавання, першакласнай зброяй. Многа жанчын поплеч з мужчынамі са зброяй у руках змагаліся на франтах, у партызанскіх атрадах.

У радах народных мсціўцаў, што дзейнічалі на тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна таксама было многа жанчын. У атрадзе імя Суворава ведалі жанчын-партызанак Вольгу Міхайлаўну Лявонаву, Анну Уладзіміраўну Лапкоўскую, Ніну Аляксандраўну Пракапенку, Ганну Гачыцкую і Марыю Альхімёнак. Яны выконвалі баявыя заданні камандавання: хадзілі ў разведку, на баявыя аперацыі, лячылі раненых, працавалі ў партызанскай сталовай і хлебапякарні.

Былыя партызаны нашага атрады памятаюць ласкавыя рукі медыцынскай сястры-партызанкі Ніны Аляксандраўны Пракапенкі. Не адно выратавала яна жыццё, не адну загаіла рану, падтрымала ласкавым словам у цяжкія гадзіны.

Незлічонае гора прынесла жанчынам вайна. Многія з нас недачакаліся з вайны сваіх дзяцей, мужоў, братоў і сясцёр. Але мы выстаялі ў змаганні, не скарыліся ў бядзе, перамаглі і нанава адбудавалі свой край. І стала жанчына-партызанка працаўніцай, шчаслівай жанчынай-маці. Шчасце прыйшло да нас.

Але ёсць на свеце людзі, якім не падабаецца наша савецкае жыццё. Ворагі яшчэ не адмовіліся ад сваіх чорных планаў. Я звяртаюся ў гэты дзень да ўсіх жанчын раёна і заклікаю сваёй самаадданай працай мацаваць магутнасць Савецкай Радзімы, каб не дапусціць вайны.

**М. АЛЬХІМЁНАК,**
**настаўніца Лешнянскай пачатковай школы,**
**былая разведчыца партызанскага атрада**
**імя Суворава Першай Дрысенскай брыгады**